



# «ШЧОДРА» Ў ШВАБАХ



Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.

У вёсцы Швабы Лагойскага раёна спрадвеку калядаванне адбывалася на стары Новы год і называлі яго адным словам — «Шчодра». У гэты час праходзіць багатая, альбо шчодрая, куцця. Шчодрай называюць і жанчыну, якая носіць калядную зорку і шчодра пасыпае зернем хаты і іх гасцінных гаспадароў.

*«Сею-сею, пасяваю,*
*Дабрабыту Вам жадаю!*
*Жадаю табе, Гаспада́ру,*
*І ў каморы, і ў амбары*
*Курэй падпечак*
*І аўса засечак!...»*

Так зычыць гаспадарам Шчодра — галоўная гераіня швабскага гурта. А ў гурце калядоўшчыкаў абавязкова ёсць і каза аднарогая (як жа без казы!), і мядзведзь, і цыганы, і Дзед Мароз са Снягуркай, і вясёлы музыка. Гэтым разам швабскія культработнікі не «парушылі» святочнай традыцыі і, як стала брацца на прыцемкі, запрэглі коней і адправіліся на калядаванне. І, як заўсёды, у вясковых хатах гучала спрадвечнае:

*«Прыйшла Каляда да з вечара,*
*Прынесла дудак рэшата,*
*Паставіла на стаўпе,*
*Сама села да на куце!...»*

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**
**Больш здымкаў з вясёлых швабскіх Каляд глядзіце на сайце zviazda.by**





